*А.Р.Агееў*

## Праблемы вяртання гістарычных урбанонімаў цэнтру Магілёва

Урбанонімы – такія ж каштоўныя помнікі гісторыі, як і старажытныя будынкі ці музейныя рэчы. Яны ўзнікалі і адбіраліся на працягу стагоддзяў. Таму маюць не толькі функцыянальнае значэнне, але і культурную, і гістарычную вартасць.

За савецкі час урбанімія – сукупнасць назваў унутрыгарадскіх аб'ектаў – непазнавальна змянілася. Не стаў выключэннем і Магілёў. Толькі гідронімы – назвы невялічкіх рэчак – засталіся некранутымі. Назвы ж вуліц, плошчаў, завулкаў мяняліся пасля 1917 года нярэдка па некалькі разоў. Першыя перайменаванні пачаліся ў 1919 годзе. Паступова горад займеў тыповую сукупнасць стандартных савецкіх назваў. Сёння без спрадвечных урбанонімаў Магілёў выглядае, як пасля пажару.

У сярэдзіне 1990-х гадоў у горадзе налічвалася 875 пазіцый назваў, з іх вуліц – 380, завулкаў – 389, плошчаў – 5, праспектаў – 4, бульвараў – 4 і г. д. Па падліках вядомага магілёўскага гісторыка І.Пушуна, з агульнай колькасці назваў да гісторыі і культуры Магілёва маюць адносіны каля 1% назваў; 3% адносяцца да гісторыі і культуры Беларусі (нават калі яна знаходзілася ў складзе іншых дзяржаў); 2,5% складаюць мікратапанімічныя назвы; 4% складаюць назвы ў гонар тых, хто абараняў ці вызваляў горад. Астатнія амаль 90% не маюць непасрэднага дачынення да гісторыі Беларусі. З іх 10% адносяцца да рэвалюцыйнага і камуністычнага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мінулага (з спіса выключаны рэвалюцыянеры, якія нарадзіліся ці жылі ў Магілёве); назвы ў гонар выдатных пісьменнікау і кампазітараў, якія не маюць непасрэдных адносінаў да нашага горада, складаюць 10%; найвялікшы аб'ём – 69,5% – складаюць назвы геаграфічнага, кліматычнага і іншага паходжання. Варта адзначыць, што 75–80% назваў такія ж, як у іншых гарадах Беларусі і Расіі. Магілёўскія урбанонімы не адлюстроўваюць адметнасці горада, яго гістарычную і культурную спадчыну. Варта адзначыць і тое, што імёны рэвалюцыянераў носяць менавіта цэнтральныя урбанонімы, якія і вызначаюць імідж горада.

Праблема комплекснай рэгенерацыі цэнтраў гарадоў Беларусі не можа быць вырашана без аднаўлення гістарычнай тапаніміі. Пры гэтым апошняя задача рашаецца значна прасцей і хутчэй, чым вырашаецца агульная праблема. Пасля 1991 года неабходнасць пазбаўлення урбаніміі ад залішняй ідэалагізацыі стала відавочнай. Выканкам Магілёўскага гарсавета рашэннямі ад 26 лютага 1992 г. і 17 мая 1993 г. стварыў тапанімічную камісію, у якую ўваходзяць вядучыя музейныя работнікі, гісторыкі, прадстаўнікі ветэранскіх арганізацый і ўладных структур.

На першым пасяджэнні камісіі былі зацверджаны прынцыпы найменняў у Магілёве, у якіх перавага аддавалася мясцовай гісторыі, ставілася задача вярнуць Магілёву яго «беларускасць». У выніку дзейнасці камісіі гарвыканкам згадзіўся вярнуць валу «Чырвонай зоркі» назву «Архірэйскі вал», некалькі другарадных вуліц былі перайменаваны ў гонар магілёўскіх летапісцаў.

Новы склад камісіі пачаў працаваць у 1997 г. Яна збіралася 2–4 разы на год, абмяркоўвала прапановы новых назваў, пытанні дэмантажу старых і ўсталявання новых мемарыяльных знакаў і помнікаў. Праца камісіі стала своеасаблівай пляцоўкай, дзе вёўся даволі плённы дыялог улады і творчай інтэлігенцыі і дзе новыя праекты звяраліся з грамадскай думкай. Тым не менш, пытанне аб вяртанні цэнтру горада гістарычных назваў сур'ёзна не абмяркоўвалася. Сябрам камісіі нават прыходзілася абара-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

няць захаваныя урбанонімы. У выніку праблема абвастрылася. На яе сталі звяртаць увагу госці горада, прычым не толькі з «захаду», але , цяпер, і з «усходу».

У 2002 годзе дзейнасць камісіі зноў была адноўлена па ініцыятыве дэпутатаў гарсавета. Распрацавана «Канцэпцыя ўшанавання гістарычнай і культурнай спадчыны горада Магілёва». У яе аснову пакладзены наступныя канцэптуальныя прынцыпы:

– гістарычнасць (у першую чаргу вяртаюцца гістарычныя назвы часоў існавання Магілёўскага самакіравання 1577-1775 гг., затым, часткова, часоў Расійскай імперыі);

– ушанаванне мясцовых мікратапонімаў;

– ушанаванне славутых магілёўцаў;

– ушанаванне агульнагістарычных і культурных падзеяў, непасрэдна звязаных з гісторыяй і культурай Магілёва і Рэспублікі Беларусь;

– ушанаванне гарадоў-пабрацімаў.

Камісія прыняла праграму мерапрыемстваў на 2003–2005 гады, якая накіравана на рэалізацыю прынцыпаў канцэпцыі, у тым ліку вяртання традыцыйных назваў гістарычнаму цэнтру Магілёва.

У сувязі з неабходнасцю правядзення рэгенерацыі гістарычнай урбанімії ў большасці гарадоў і мястэчак Беларусі прапаную ў пастанове канферэнцыі адзначыць:

«Канферэнцыя звяртаецца да гарадскіх і пасялковых Саветаў з заклікам актывізаваць працу па вяртанню гістарычных назваў вуліц, плошчаў і іншых урбанонімаў населеных пунктаў як часткі працэсу рэгенерацыі гістарычных цэнтраў гарадоў і мястэчак».

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова